# КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД

**Перакладзіце з рускай мовы на беларускую наступныя словы:**

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5.** Забота. **6.** Существо. **9.** Мурлыканье. **10.** Одежда. **11.** Тропа, тропка. **13.** Глазница. **14.** Отрезок. **19.** Ситник (бот.). **21.** Имение. **22.** Кусок. **23.** Бродяжничать, скитаться. **24.** Точно, достоверно. **25.** Произойти, приключиться. **26.** Молодило (бот.).

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Блуждание, шатание. **2.** Половица, мостовина. **3.** Существенно. **4.** Желудок. **7.** Нищий. **8.** Обрезок кожи. **11.** Бедро, ляжка (часть туши). **12.** Отпечаток, оттиск. **15.** Горячая зола. **16.** Ссора, душевные муки, тоска. **17.** Врасплох, внезапно. **18.** Порок, изъян. **20.** Хотеться, не терпеться. **21.** Молния.

**Склала Таццяна КУЗЬМІЧ,**
*г. Віцебск.*



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ.**
**Па гарызанталі:** 5. Клопат. 6. Істота. 9. Варкатня. 10. Вопратка. 11. Сцяжына. 13. Вачніца. 14. Адцінак. 19. Кругляк. 21. Маёнтак. 22. Кавалак. 23. Бадзяцца. 24. Дакладна. 25. Стацца. 26. Скочкі. **Па вертыкалі:** 1. Блуканне. 2. Масніца. 3. Істотна. 4. Страўнік. 7. Жабрак. 8. Скурат. 11. Сцягняк. 12. Адбітак. 15. Прысак. 16. Згрызота. 17. Зняцку. 18. Загана. 20. Карцець. 21. Маланка.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.52 | 16.59 | 8.07 |
| Віцебск — | 8.48 | 16.43 | 7.55 |
| Магілёў — | 8.43 | 16.49 | 8.06 |
| Гомель — | 8.32 | 16.53 | 8.21 |
| Гродна — | 9.07 | 17.16 | 8.09 |
| Брэст — | 9.00 | 17.23 | 8.23 |

## Месяц

*Поўня 25 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

*Пр.* Вікенція, Віктара, Максіма, Сцяпана, Фёдара.
*К.* Флоры, Эмы, Аляксандра, Андрэя, Рамана, Яна.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА 0..+2°С | КІЕЎ 0..+2°С | РЫГА -3..-1°С |
| ВІЛЬНЮС -3..-1°С | МАСКВА -2..0°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -1..+1°С |




## РАБАВАННЕ ПАД ПРЫЦЭЛАМ

За здзяйсненне рабунку супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС сталіцы затрымалі 41-гадовага жыхара мікрараёна Серабранка. Той проста пад камерамі відэаназірання зняў з вешалкі спартыўны касцюм і... накіраваўся з ім да выхаду. Прадавец убачыла, што мужчына не збіраецца аплачваць тавар і паспрабавала яго спыніць, але зламысніку ўдалося ўцячы. Аднак аператыўнікі затрымалі яго літаральна па «гарачых слядах». Дзеянні мужчыны кваліфікаваныя як рабаванне. Высветлілася, што раней ён быў судзімы за згвалтаванне і хуліганства. Спартыўны касцюм грамадзянін вынес з крамы сэканд-хэнд.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Самая эфектыўная маска для твару.**

**Бярэцца лімончык, рэжацца на сподачак, у чарачку налівaецца каньячок. Каньячок выпіваем, лімон з'ядаем. Твар усміхаецца і свяжэе.**

— Як даць больш свабоды жанчыне?

— Паўлічыць плошчу кухні.

**Вось ужо 32 гады я кожны дзень устаю з ложка, гэта больш за 11 600 падыходаў на прэс. Дзе мае кубікі?**

Дзеці — кветкі жыцця :)

Дачка ў мультфільме пачула фразу «Страціў розум ад кахання» і вырашыла высветліць гэтае пытанне ў нас. Сядзім з жонкай, абедаем. Падыходзіць і пытаецца:

— Тата, а вось ты адразу розум страціў, як толькі маму ўбачыў, або пасля таго, як вы ажаніліся?

**Баец пажарнай аховы, рызыкуючы жыццём, вынес з палаючага банка мяшок з мільёнам долараў. Дзе цяпер знаходзіцца герой, да гэтага часу невядома.**

Даты | Падзеі | Людзі

## 24 ЛІСТАПАДА

**1859** год — у кніжных крамах Лондана ў продажы з'явіўся зялёны томік кнігі Чарльза Дарвіна пад назвай «Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору, або Захаванне рас найбольшага спрыяння ў барацьбе за жыццё», у якой асноўнай рухаючай сілай эвалюцыі аўтар назваў натуральны адбор і няпэўную зменлівасць. Велізарны па тых часах тыраж кнігі ў 1250 асобнікаў быў раскуплены за дзень і вызначыў сабой з'яўленне ў сусветнай навуцы тэорыі эвалюцыі жывой прыроды, што стала краевугольным каменем сучаснай біялогіі, або дарвінізму. Чарльз Роберт Дарвін (1809-1882) — англійскі прыродазнавец, натураліст і падарожнік, замежны член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. Абагульнішы вынікі ўласных назіранняў і дасягненні сучаснай яму біялогіі і селекцыйнай практыкі, ён выявіў асноўныя фактары эвалюцыі арганічнага свету. Пасля выхаду кнігі ва ўсім свеце бушавалі страсці і ішла барацьба меркаванняў — за дарвінізм з аднаго боку, супраць дарвінізму — з другога. Гулі аўдыторыі, хваляваліся вучоныя і публіцысты, адны крытыкавалі Дарвіна, іншыя ім захапляліся, а сам вучоны, між тым, працягваў працаваць. Ён напісаў яшчэ тры кнігі па пытаннях эвалюцыі, існаванне якой было прызнана большасцю навукоўцаў яшчэ пры жыцці Дарвіна, у той час як яго тэорыя натуральнага адбору — асноўнае тлумачэнне эвалюцыі — стала агульнапрызнанай толькі ў 30-х гадах XX стагоддзя.



**1902** год — нарадзіўся (вёска Баруны, цяпер Ашмянскі раён) Мікалай Сямёнавіч Арэхва, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, гісторык, заслужаны работнік культуры Беларусі (1981). З 1923 года — у апараце ЦК ВЛКСМ. У 1924-м — старшыня Часовага беларускага бюро ЦК РКСМ, першы сакратар ЦК камсамола Беларусі. З 1925 года быў на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі: сакратар Віленскага акруговага камітэта, член ЦК КПЗБ. У 1926-м быў арыштаваны і 5 гадоў знаходзіўся ў турмах Польшчы. У Вялікую Айчынную ваяваў у Войску Польскім. У 1956-1984 гадах — навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Укладальнік зборнікаў дакументаў, аўтар успамінаў і даследаванняў па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Памёр у 1990 годзе.

**1960** год — 55 гадоў таму нарадзіўся (г. Мінск) Уладзімір Аляксеевіч Ермалаеў, ваенны дырыжор, заслужаны артыст Беларусі (1998). У 1985-м скончыў Маскоўскую кансерваторыю. З 1985 года — дырыжор аркестра танкавай брыгады, з 1989-га — дырыжор, намеснік начальніка аркестра штаба БВА, з 1994-га — дырыжор, начальнік, мастацкі кіраўнік Ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, з 2004 года — начальнік ваенна-аркестравай службы, галоўны ваенны дырыжор Узброеных Сіл Беларусі.

## Было сказана

**Максім ЛУЖАНІН, паэт, празаік:**

*Не крочпа сцежкі бакавых —*
*Ямчэй сказаць, паменш зрабіць, —*
*Бяры адказ сабе на шыю,*
*Не на сяброўскія гарбы.*



Малюнак Алега ГУЦОЛА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4630.
Нумар падпісаны ў 19.30 23 лістапада 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12